ценными для сохранения культурно-исторического наследия прошлого, с одной стороны, а с другой – для выявления перспектив будущего развития этого региона.

---

1. *Барышев, Г.И.* Школьный театр Белоруссии XVIII века / Г.И. Барышев. – Минск : Мин. ин-т культуры, 1990. – 91 с.

2. *Дадзіёмава, В.У.* Музычная культура Беларусі XVIII стагоддзя: гісторыка-тэарэтычнае даследванне / В.У. Дадзіёмава. – выд. 2-е, перап. – Мінск : Беларус. дзярж. акадэмія музыкі, 2004. – 384 с.

3. *Дадиомова, О.В.* Музыкальная культура городов Белоруссии в XVIII века / О.В. Дадиомова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 207 с.

4. *Лозицкий, А.И.* Навоша, маляр наш Пінскі / А.И. Лозицкий // ЛіМ. – 1969. – 6 чэр.

5. *Пракапцова, В.П.* Мастацкая адукацыя ў Беларусі / В.П. Пракапцова. – Минск : Бел. ун-т культуры, 1999. – 210 с.

6. *Энцыклапедыя* гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 5. М – Пуд./ Беларус. Энцыкл.; рэдкал.: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) [і інш.]; маст. Э.Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 1999. – 592 с. : іл.

## ТРАДЫЦЫІ І НАВАЦЫІ Ў БЕЛАРУСКІМ НАРОДНЫМ СВЯЦЕ “КУПАЛЛЕ”

**Гуд Н. І.**
*старшы выкладчык кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці*
*УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

Летні цыкл земляробчага календара беларусаў пачынаўся з Купалля. У старажытных славян Купалле – адно з самых значных свят народнага календара, прымеркаванага да летняга сонцастаяння. Святкавалася яно ў гонар сонца, якое ў гэты час дасягала свайго апагею. Адзначалася як свята найвышэйшага росквіту жыватворных сіл зямлі, у першую чаргу раслiннасці, збажыны. Святкаванне Купалля, паводле звычаю, асвечанага векавечнай традыцыяй (яго вытокі навука бачыць яшчэ ў першабытным грамадстве), адбывалася ў ноч з 23 на 24 чэрвеня ст.ст. (з 6 па 7 ліпеня н. ст.). Сама купальская ўрачыстасць прыпадала на вечар і ноч. У дзень або нават раніцай 23 чэрвеня дзяўчаты і жанчыны з песнямі ішлі ў поле і на луг збіраць купальскія зёлкі: браткі, руту, васількі, багаткі, купалінкі, папаратнік. Сабраныя травы і кветкі выкарыстоўвалі і для вянкоў, і для лекаў і ежы, і каб адвесці ад свайго дома ведзьмаў. Хлопцы тым часам (у іншых мясцовасцях і ўся моладзь разам) збіралі розную старызну: зношаныя кажухі, світкі, атопкі, старыя колы, клёпкі ад бочак, леташнюю кудзелю, вывозілі ўсё гэта за ваколіцу. Месца для вогнішча выбіралі звычайна на ўзлессі, на ўзгоркавым беразе рэчкі, пры жыце, а ў мястэчку – на плошчы. На захад сонца святочна прыбраная грамада моладзі вясковай вуліцай з песнямі, у якіх заклікалі на купалле, выбіралася на абранае для кастра месца. У старажытнасці купальскі агонь раскладвалі, тручы кавалкі дрэва адзін аб адзін. Адначасова ўздымалі на высокім шасце прамасленае запаленае кола, што відаць, сімвалізавала сонца. Прыносілі з сабой, або тут жа



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ля агню рыхтавалі вячэру, якая складалася з яечні, верашчакі, кулагі (страва з мукі), варэнікаў з грэцкай мукі, бліноў. Пасля вячэры пачыналіся гульні. Скакалі праз агонь, перакідаваліся вянкамі праз яго, вадзілі карагод з песнямі, танцавалі, пелі, слухалі розныя чарадзейныя гісторыі. Дзяўчаты кідалі на рачную плынь вянкі, загадаўшы на будучае замужжа, на долю. Абавязковым момантам святкавання Купалля было купанне ў рацэ на зары і назіранне за ўзыходам сонца. Людзі верылі, што купальская вада не толькі ачышчае, але і здольна выгнаць з цела хваробу, умацаваць яго фізічна. Пасля Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі ў святкаванні Купалля з’яўляюцца новыя тэндэнцыі пры адначасовым бытаванні традыцыйных элементаў. Мы не маем звестак пра наладжванне “чырвонага Купалля” камсамольцамі рэспублікі, але былі спробы ў асяроддзі інтэлігенцыі, асабліва на тэрыторыі Заходняй Беларусі, зрабіць Купалле святам-сімвалам беларускага этнасу.

У вёсцы працягвалі бытаваць шматлікія традыцыйныя элементы купальскага святкавання. Моладзь паліла кастры, вадзіла карагоды, спявала песні і танчыла, дзяўчаты плялі вянкі і, кідаючы іх на ваду, варажылі пра будучы лёс. Старэйшыя напярэдадні Купалля збіралі лекавыя расліны. Літаратурныя крыніцы, матэрыялы этнаграфічных экспедыцый сведчаць пра тое, што асноўныя абрадавыя моманты Купалля існавалі ў сельскай мясцовасці Беларусі да пачатку Вялікай Айчыннай вайны [1].

У 1980-х гадах пачалі друкаваць сцэнарыі і метадычныя рэкамендацыі правядзення Купалля, артыкулы, зборнікі, дзе абагульняўся лепшы вопыт арганізацыі свята.

У гарадах і вёсках Беларусі Купалле, поўнасцю страціўшы сваю міфалагічную і аграрную аснову, праводзілася як вясёлае гулянне ў час росквіту жыццядайных сіл прыроды. Некаторая ж традыцыйная сімволіка і атрыбутыка захоўвалася ў знешнім афармленні свята, гучалі таксама традыцыйныя купальскія песні. Галоўнымі дзеючымі асобамі на Купаллі таго перыяду былі Купала і Купалінка, якія ўвасаблялі асноўны змест свята і яго адметнасць. Разам з імі выступалі ў адпаведнасці са сцэнарыямі разнастайныя міфічныя істоты ведзьмакоў, чарцей, лесавікоў, вадзянікоў, кікімар, русалак, а таксама казачныя і літаратурныя героі: Несцерка, Гусляр, Нептун. На Купаллі выступалі самадзейныя калектывы, праводзіліся масавыя гулянні, спаборніцтвы, конкурсы, у якіх удзельнічалі ўсе жадаючыя. На святах Купалля, якія праводзіліся ў калгасах і саўгасах, услаўлялі перадавікоў сельскагаспадарчай вытворчасці, многім з якіх надавалася ганаровае права запаліць купальскі касцёр. Купалле ў гарадах насіла характар масавага гуляння.

У 1990-я гады з’явіліся новыя рысы ў святкаванні Купалля, хоць яно і не было замацавана на дзяржаўным узроўні. Сёння частка беларусаў адзначае Купалле ў ноч з 23 на 24 чэрвеня, частка – у ноч з 6 на 7 ліпеня.

У апошнія гады культработнікі ўключаюць у сцэнарый правядзення Купалля мясцовы фальклорна-этнаграфічны матэрыял, сабраны шляхам апытання людзей старэйшага ўзросту. Такім чынам былі адроджаны і праведзены аўтэнтычныя святы Купалля сіламі мясцовых фальклорных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

калектываў у в. Бярдовічы Слонімскага раёна, в .Бездзеж Драгічынскага раёна, в. Крулеўшчына Докшыцкага раёна, в. Запясочча Жыткавіцкага раёна, в. Хрыса Бярозаўскага раёна і многіх іншых мясцінах Беларусі [2].

У беларускіх гарадах святкаванні Купалляператварыліся ў тэатралізаваныя прадстаўленні з некаторымі знешнімі атрыбутамі традыцыйнай купальскай абраднасці, да якіх адносяцца ўрачыстае распальванне вогнішча, факельныя шэсці, карагоды, выкананне купальскіх песень, спальванне чучалаў, шэсце да ракі, сустрэча сонца, назіранне за яго ігрой.

Старажытнае народнае свята летняга сонцастаяння, якое вызвалілася ад рэлігійнай і язычніцкай асновы, з кожным годам заваёўвае ўсё большую папулярнасць, ператвараючыся ў новае масавае свята, пабудаванае на народных традыцыях. Адраджэнню гэтага прыгожага паэтычнага рытуалу надаюць шмат увагі вучоныя і дзеячы культуры. 118 культурна-асветніцкіх устаноў Беларусі штогод прымаюць удзел у правядзенні Купалля, пераасэнсоўваючы традыцыйныя элементы, прыўносяць у яго шмат новага.

Купалле на сучасным этапе праводзяць у розных жанравых формах – фальклорна-этнаграфічнага ці тэатральнага свята, карнавалу, народнага гуляння, фестывалю купальскага фальклору. Але ў большасці месцаў арганізатары не захоўваюць адну з галоўных жанравых характарыстык народнага свята – масавасць удзелу і ўвасабляюць Купалле ў форме прадстаўлення. Даволі часта прыходзіцца назіраць, што дзеянні каля кастра арганізуе нязначная колькасць “ражаных”, а большасць прысутных застаюцца пасіўнымі гледачамі. Гэта зніжае эфектыўнасць эмацыянальнага і выхаваўчага ўздзеяння свята.

Адной з праблем сучаснага Купалля стала распрацоўка яго літаратурнай асновы. Справа ў тым, што аўтарскія сцэнарыі, якія рассылалі і рассылаюць у раёны, вёскі рэспублікі абласныя навукова-метадычныя цэнтры, робяць добрую і карысную работу. З аднаго боку, яны знаёмяць культработнікаў з высокамастацкімі ўзорамі сцэнарна-рэжысёрскіх распрацовак свята. Але, з другога боку, многія дзеячы культуры на месцах, не крытычна ставячыся да праблемы адраджэння рэгіянальных традыцый, аўтаматычна ўвасабляюць прапанаваны сцэнарый цалкам, у выніку чаго два-тры сцэнарыі штогод “гуляюць” амаль па ўсёй Беларусі. Гэта прыводзіць да штампу і аднастайнасці, пазбаўляе свята тэрытарыяльных асаблівасцей, наносіць вялікую шкоду захаванню і развіццю мясцовых традыцый.

Таму вывучэнне, асэнсаванне і ўкараненне ў сучаснае Купалле рэгіянальных і мясцовых традыцый яго правядзення на аснове мастацка-гістарычнай спадчыны беларусаў з’яўляецца актуальным і сацыяльна значным.


1. *Гуд, П.А.* Беларускае Купалле: кампазіцыя і семантыка абрадавых дзей / П.А. Гуд. – Мінск, 1999. – 135 с.

2. *Кухаронак, Т.І.* Маскі ў каляндарнай абраднасці Беларусаў / Т.І. Кухаронак – Мінск, 2001. – С. 114-126.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ